# ЯГАДНА-КВЕТКАВЫ КАЛЕЙДАСКОП



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** «Пах — ... кветкі». Ж. Верн. **5.** Шаўковая тканіна з разводамі. **7.** Народная назва зарасніка ажыны. **10.** «Мусіць у сунічкі, // Унь у тыя лукі, // ... з сястрой ідзе». З верша Я. Коласа «Летам». **11.** Не ўсякая ... крапіва, не ўсякая падчарыца — макаў цвет (прык.). **12.** Ліпень — месяц ягад, зялёная гарачая ... (прык.). **15.** Грыб не хлеб, а ягада не ... (прык.). **16.** «Не глядзі, што ... з кіслінкай: // І ў жыцці не ўсё — суцэльны мёд». З верша А. Ляўковіч «Журавіны». **17.** Тое, што і сечка. **18.** «Ой, ..., ... мой чысты, // Валакністы, залацісты!» З верша Я. Купалы «Лён». **20.** Чаравікі футбалістаў. **21.** Тое, што і сукенка. **24.** Роды ў каровы. **25.** «... — гэта кветка, якую ніхто не любіць». Э. Уілкокс. **27.** ... кветачка не робіць вясны (прык.). **28.** Чым прыгажэйшая ..., тым даўжэйшыя ў яе шыпы (прык.).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** ... , трамбоз, цынга; хваробы, для прафілактыкі якіх карысна спажываць чарніцы, суніцы і іншыя ягады. **2.** Вялікі майстар сваёй справы (перан.). **3.** Салодкія цёмна-сінія ягады, падобныя на парэчкі. **4.** ..., ці ляшчына; лічылася, што цвіце ён толькі ўначы ў чысты чацвер. **5.** Багіня-маці, галоўнае жаночае бажаство ў многіх міфалогіях свету. **6.** Гарадскі пасёлак на Брэстчыне, герб якога ўпрыгожвае вянок з чырвоных руж. **8.** «Едуць у брусніцы, // Дзеўкі, ...». З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды». **9.** «У лес чарніцы-... // Нарэшце мы збіраць пайшлі». З верша Д. Пятровіча «Чарніцы». **13.** Сорт слівы, выведзены беларускімі селекцыянерамі. **14.** «... смяецца кветкамі». Р. Эмерсан. **17.** Чырванее ... — лета палавіна (прык.). **19.** «А нізам пясціца з шыпшыннікам ... // І туліць да малін свой чорны твар ажына». З паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». **22.** «Многа песень спета // Пра шчодрае .... // Толькі Ганначка не спявае, // У буйных травах кветкі збірае». З беларускай народнай песні «Пойдзем, пойдзем лугам». **23.** «О Беларусь, мая шыпшына, // зялёны ліст, чырвоны ...». З верша У. Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына». **25.** Танцавальны крок. **26.** Літара старажытнарускага алфавіта.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**

*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы**

**Па гарызанталі:** 1. Душа. 5. Муар. 7. Скарбарыха. 10. Брат. 11. Мачаха. 12. Пара. 15. Трава. 16. Ягады. 17. Рэзка. 18. Лянок. 20. Буцы. 21. Плацце. 24. Ацёл. 25. Пустазелле. 27. Адна. 28. Ружа. **Па вертыкалі:** 1. Дыябет. 2. Ас. 3. Ірга. 4. Арэх. 5. Ма. 6. Ружаны. 8. Маладзіцы. 9. Чараўніцы. 13. Нарач. 14. Зямля. 17. Рабіна. 19. Каліна. 22. Лета. 23. Цвет. 25. Па. 26. Ер.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.39 | 21.46 | 17.07 |
| Віцебск — | 4.20 | 21.44 | 17.24 |
| Магілёў — | 4.29 | 21.36 | 17.07 |
| Гомель — | 4.35 | 21.23 | 16.48 |
| Гродна — | 5.56 | 21.59 | 16.03 |
| Брэст — | 5.06 | 21.50 | 16.44 |

## Месяц

*Першая квадра 20 чэрвеня.*

*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Акуліны, Антаніны, Ганны, Пелагеі, Дзмітрыя, Івана, Савы.*

***К.*** *Дануты, Магдалены, Паўліны, Паўла, Рудольфа, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 26 ЧЭРВЕНЯ




**1918** год — нарадзіўся Генадзь Будай (горад Дзяржынск Мінскай вобласці), беларускі грамадскі і культурны дзеяч, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў Дзяржынскага антыфашысцкага падполля, партызанскага руху ў Мінскай і Баранавіцкай абласцях, рэдактарам падпольных газет «Народны мсцівец», «Чырвоная звязда». Пасля вайны на журналісцкай рабоце. У 1959—1986 гг. намеснік галоўнага рэдактара, галоўны рэдактар часопіса «Камуніст Беларусі». Аўтар мемуараў «Свінцом і словам». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984).

**1928** год — нарадзіўся Сяргей Пеўны, заслужаны архітэктар Беларусі. У 1962—2001 гг. — галоўны архітэктар праектаў у інстытуце «Гомельграмадзянпраект». Асноўныя працы ў Гомелі: комплекс кінатэатра імя Калініна і кафэ «Маладзёжнае», 2-9-паверхавы комплекс будынкаў «Галоўпалессеводбуда», будынак Прыёрбанка.

**1938** год — адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР 1-га склікання. Былі абраныя 273 дэпутаты, з іх — 66 рабочых, 74 калгаснікі, 133 служачыя, 206 з'яўляліся членамі і кандыдатамі ў члены Камуністычнай партыі.

**1943** год — пачаў дзейнічаць Мінскі падпольны абкам ЛКСМБ, пад кіраўніцтвам якога знаходзіліся Мінскія міжраённы, гарадскі і Паўднёвы камітэты ЛКСМБ, арганізацыі і групы мінскага маладзёжнага падполля. Базаваўся ў асноўным у Любанскім раёне.

**1968** год — заснавана Дзяржаўная прэмія Беларусі па архітэктуры.




**1888** год — нарадзіўся Сяргей Абнорскі, рускі мовазнаўца, дыялектолаг і лексікограф, заснавальнік Інстытута рускай мовы.

**1925** год — у Галівудзе адбылася прэм'ера фільма Чарлі Чапліна «Залатая ліхаманка».

**1940** год — у СССР уведзена крымінальная адказнасць за спазненне на працу больш чым на 21 хвіліну.

**1945** год — зацверджана званне Генералісімуса Савецкага Саюза. На наступны дзень першым уладальнікам яго стаў Іосіф Сталін.

**1953** год — на пасяджэнні ЦК КПСС арыштаваны Лаўрэнцій Берыя.

**1973** год — завершаны 9-дзённы візіт генеральнага сакратара ЦК КПСС Леаніда Брэжнева ў ЗША. Паездка генеральнага сакратара была адказам на наведванне годам раней СССР прэзідэнтам ЗША Рычардам Ніксанам, калі быў падпісаны Дагавор аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў.



# УСМІХНЕМСЯ

**Найлепшае, да чаго жанчына магла дадумацца і вымавіць гэтую глыбокую думку ўголас, дык гэта фраза: «Прабач мне, ты сам вінаваты».**

— А ў вас ёсць што-небудзь вегетарыянскае?
— А як жа! Гарэлка з адборных сартоў пшаніцы, піва з ячменю, віно і каньяк з вінаграду!

**Самую страшную магнітную буру ўбачыў мужык, які падарыў жонцы ў дзень нараджэння магніцік на халадзільнік.**

— Цэлы год вучыў па дапаможніку японскую.
— Ну, і як поспехі?
— Праз год высветліў, што вучыў карэйскую.

**Учора зрабіў дома генеральную прыборку, сёння прыйшоў, першая думка: «Абакралі!»**

— А нашаму праграмісту за тыдзень другі зуб вырвалі.
— Ён так дрэнна пісаў код?



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2348.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 чэрвеня 2018 года.